# ТЭМА «РАСКІДАНАГА ГНЯЗДА» Ў АПОВЕСЦІ ВАСІЛЯ БЫКАВА «ЗНАК БЯДЫ»

**М. В. Яромка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*maryna.yaromka@gmail.com;*
*навук. рук. – Г. М. Бутырчык, канд. філ. навук, дац.*

Артыкул прысвечаны тэме «раскіданага гнязда» ў аповесці В. Быкава «Знак бяды». У творы паказанае разбурэнне сям’і, што ставіць акцэнт на лёсе галоўных герояў як асобных людзей, пазбаўленых падтрымкі іншых. Канцэпцыя дому фарміруецца пры дапамозе шматузроўневай прасторавай арганізацыі, якая карэлюе са структурай бінарнай апазіцыі «свой – чужы». Дынаміка твора дасягаецца праз пераасэнсаванне замкнутай прасторы ў рамках складанай часавай структуры, распрацоўку матыву мяжы.

**Ключавыя словы:** апазіцыя «свой – чужы»; Васіль Быкаў; «Знак бяды»; канцэпцыя дому; прасторавая структура; «Раскіданае гняздо»; тэма сям’і; часавая структура.

Тэмы дому і сям’і з’яўляюцца ўніверсальнымі і раскрываюцца ў шматлікіх творах беларускай і сусветнай літаратуры. П’еса Я. Купалы (1882–1942) «Раскіданае гняздо» (1913) дала назву трагедыі разбуранага дому, якая знайшла выяўленне ў шэрагу твораў беларускіх пісьменнікаў: знішчэнне і гвалт падчас вайны ў М. Гарэцкага (1893–1938), адабраныя «вялікім злодзеем» дом і час у К. Чорнага (1900–1944), немагчымасць гаспадарыць на ўласнай зямлі ў І. Мележа (1921–1976), заняпад роду ў У. Караткевіча (1930–1984). Падсумоўваючы, «раскіданае гняздо» можна акрэсліць як адсутнасць уласнага свету, якая ўвабірае ў сябе знішчэнне дому, разбурэнне сям’і, пазбаўленне магчымасці жыць у пэўных абставінах, глыбокі ўнутраны крызіс.

У аповесці В. Быкава (1924–2003) «Знак бяды» (1982) тэма «раскіданага гнязда» дазваляе раскрыць трагедыю герояў на шэрагу ўзроўняў. Уласны свет атаясамліваецца ў творы з домам, які, акрамя самога месца, уключае ў сябе найбліжэйшых, найбольш «сваіх» людзей – сям’ю. У ваенны час Пятрок і Сцепаніда застаюцца на хутары адны – сям’я, адпаведна, складаецца толькі з іх дваіх. Пры гэтым героі часта дзейнічаюць паасобку: Сцепаніда сварыцца, што Пятрок робіць не тое [1, с. 9, 27], Пятрок, у сваю чаргу, наракае на Сцепаніду [1, с. 62, 64]; у ранейшы час рашэнні ўзяць зямлю [1, с. 152], уступіць у калгас [1, с. 144] прымае Сцепаніда пры супраціве Петрака, яна ж вырашае, што Пятрок паедзе ў Менск [1, с. 268]. Адсутнасць размовы, разумення паміж героямі паказвае сям’ю, дзе ўсе залежаць ад волі аднаго чалавека. У Я. Купалы дадзеная праблема паказаная праз вобразы Лявона і Сымона, калі іх упартасць вядзе іншых да гібелі. Аналагічная роля Сцепаніды – яна прымае фатальныя для сябе самой і для Петрака рашэнні. Неабходна зазначыць, аднак, што адказнасць за ўласныя ўчынкі героі нясуць не столькі перад сям’ёй, колькі перад самімі сабой (разгорнутая рэфлексія над мінулым), што яшчэ раз падкрэслівае іх адасобленасць.

У думках Сцепаніды пра мінулае прысутнічае наступная характарыстыка: «Сцепаніда не чаплялася за старое – у старым у яе наўрад ці набралася б паўгода людскага жыцця, спрэс душылі работа, ранняе сіроцтва, нэндза і бяспраўе» [1, с. 141]. Ранняе сіроцтва гаворыць пра адсутнасць у гераіні сям’і, што пазбаўляе яе падтрымкі, вымушае рабіць выбар на карысць уласнай будучыні, разлічваючы адно на сябе. Сцепаніда не знаходзіць сабе месца і ў сям’і Петрака: «Якраз за тыдзень да таго ён пусціў іх на хутар, бо ў Петраковай сям'і на Выселках ім ужо стала неяк, Сцепаніда адразу не паладзіла са свякроўю і надоечы папрасіла пана Яхімоўскага, каб налета пусціў у істопку – усё роўна яна ўжо гаспадарыла на падворку і ў будынках, а новы парабак Пётра будзе ў помач, бо куды ж ён мог дзецца без хаты, без сваёй зямлі і гаспадаркі» [1, с. 148]. Пятрок, у сваю чаргу, не мае падтрымкі з боку сваякоў: «Пётра, які ў галотнай бацькавай сям'і быў нібы за парабка, так зашчыраваў на сваёй гаспадарцы, што яна спалохалася за яго здароўе» [1, с. 141]. Героі, такім чынам, ізаляваныя, бо калі людзі, якія мусяць дапамагаць блізкаму чалавеку, апынаюцца чужымі, то чакаць дапамогі ім болей няма ад каго: «Не мёд быў той хутар, але што яна магла без зямлі, без пасагу – бедная прыжывалка ў няласкавай, мала шчаслівай братавай сям'і?» [1, с. 184]. Паказальна, што звесткі пра сям’ю падаюцца як кароткія згадкі, на якіх не факусуецца ўвага, героі ніколі не гавораць пра сваякоў, што кажа пра выключанасць з іх жыцця сям’і па-за межамі ўласнага дому.

Паступовае разбурэнне сям’і акрэсленае ў аповесці наступным чынам: «Цяпер жа ёй было ўсё роўна, не вабілі і вечаровыя клопаты ў хляве ці ля печы, сям'і, лічы, не было, заставаўся толькі Пятрок; адзін за адным адышлі на той свет старыя, трохі падросшы, адляцелі дзеці, неўпрыкмет мінулася ўсё добрае і благое, што з імі звязана» [1, с. 13–14]. Сям’я фармальна існуе, але нічога, што яна мусіць прыносіць чалавеку (падтрымку сваіх, абарону ад чужых), героі не атрымліваюць – сям’і, па сутнасці, няма. Сваяцтва само па сабе не азначае, што чалавек можа лічыцца «сваім». Найбольш яскравы прыклад – ацэнка Петраком дзеянняў Гужа: «Кажа: родзіч усё ж. Каб ты спруцянеў, такі родзіч!» [1, с. 182]. У гэтым выяўляецца адсутнасць сям'і як катэгорыі з гледзішча маралі: перш за ўсё значэнне маюць якасці чалавека, ён ацэньваецца паводле ўчынкаў, а не паводле таго, кім даводзіцца героям.

В. Быкаў, пішучы пра сям'ю, выводзіць на першы план герояў як асобных людзей, адарваных ад старэйшага пакалення і ўласных дзяцей і ў той жа час адасобленых адно ад аднаго.

Цэнтральным канфліктам п'есы «Раскіданае гняздо» выступае патрабаванне пана, каб сям'я Зяблікаў з'ехала з месца, дзе яны жывуць. Разбурэнне дому паказанае наўпрост праз руйнаванне хаты і выгнанне з зямлі, перад героямі паўстае выбар: сысці ці застацца. На пэўны час яны застаюцца, працягваючы трымацца за «дом», аднак урэшце абіраюць шлях сыходу, які цягне за сабой змену ідэнтычнасці: маці з малодшымі дзецьмі становяцца жабракамі, Сымон і Зоська ідуць змагацца за будучыню. Лявон не можа перажыць страту дому, змену ўласнай ролі і гіне на самым пачатку.

У адрозненне ад п'есы Я. Купалы, у «Знаку бяды» героі цалкам пазбаўленыя магчымасці ўцячы, яны ўвесь час знаходзяцца ўнутры ізаляванага мікрасвету і не маюць выйсця вонкі. У сітуацыі пагрозы – прыход немцаў, паліцаяў – ім застаецца ўцякаць унутр сябе, што раскрываецца праз разгорнутыя ўнутраныя маналогі і рэтраспектыўныя ўстаўкі. Пры адсутнасці знешняга свету прастора пашыраецца за кошт надання ізаляванаму мікрасвету іншага значэння пры ўвядзенні розных часавых пластоў: той самы хутар, тая самая хата апынаюцца ці то доўгачаканым прытулкам, ці то эпіцэнтрам катастрофы; прастора вонкава застаецца той самай, але пераасэнсоўваецца персанажамі, што чарговы раз падкрэслівае дамінаванне ўнутранага досведу над знешнім.

Разбурэнне дому ў В. Быкава выяўляецца як праз відавочную шкоду (рабаванне гаспадаркі), так і праз сімвалічнае знішчэнне ўласнай прасторы (дом, які перастае быць домам пры чужынцах). Дом вызначаецца не толькі межамі хутара, але і наяўнасцю ў Петрака і Сцепаніды ролі гаспадароў, важнасць якой падкрэсліваецца неаднаразовым ужываннем спалучэнняў «яе, яго, свая» Яхімоўшчына [1, с. 11, 43, 177]. Пазіцыя гаспадара дае кантроль над зямлёй і домам, дазваляе мець большы ўплыў на ўласны лёс – пасля атрымання зямлі героі актыўна працуюць дзеля будучыні сям'і. Як толькі гэтая роля страчваецца, уласная прастора знікае. Так, вяртанне ў істопку пасля прыходу немцаў выступае прасторавай закальцоўкай з падзеямі 1921-га года, калі героі яшчэ не былі гаспадарамі хутара, і вяртае іх у храналагічны пачатак гісторыі, калі яны былі служкамі пана.

Унутраная прасторавая і часавая дынаміка прыводзіць да таго, што дом перастае быць канстантай, а героі, адпаведна, страчваюць надзейнае апірышча. Падчас калектывізацыі ступень кантролю Сцепаніды і Петрака над гаспадаркай меншае, яны болей не могуць разлічваць толькі на сябе, што канфліктуе з іх памкненнем адасобіцца. Далей, калі пачынаецца вайна, абставіны нясуць прамую пагрозу, што выступае чарговым крокам да страты ўплыву на сітуацыю.

Разбурэнне дому ў дадзеным кантэксце карэлюе з прасторавай структурай аповесці. У творы вылучаецца шэраг лакацый, абсяг якіх пастунова пашыраецца: істопка, хата, падворак, сядзіба, вёска, мястэчка. Кожнае з месцаў можа быць акрэсленае праз апазіцыю «свой – чужы» (унутры лакацыі – «сваё», па-за ёй – «чужое»), якая аналагічна прасторы ўтварае шматузроўневую структуру. У 1930-я падзел праходзіць па лініі «вёска – хутар»; падчас вайны «чужымі» становяцца спачатку падворак і сядзіба (рабаванне), а пасля і хата (нямецкі афіцэр, паліцаі); у фінале аповесці Сцепаніда падпальвае хату, знаходзячыся ў істопцы, апошнім «сваім» месцы, якое, аднак, забірае ў яе жыццё і знікае само. «Свая» прастора, такім чынам, звужаецца да нябыту.

Значнае месца займае матыў мяжы – ад прыдарожнага, памежнага размяшчэння хутара да хісткасці размежавання «сваіх» і «чужых». Дом уяўляе сабой прастору, мяжу якой кантралююць героі. Калі «чужыя» пераходзяць мяжу і апынаюцца ў «сваёй» прасторы, гэтая прастора перастае быць «сваёй».

Каландзёнак не наважваецца зайсці ў хату, калі ведае, што яго там не хочуць бачыць [1, с. 189]; падчас вайны ні немцаў, ні паліцаяў нічога не спыняе. Пры гэтым сціраецца і сама мяжа: чужынцы сыходзяць, але дом па-ранейшаму застаецца небяспечным месцам. Прыйшоўшы адзін раз, Гуж знішчае ўмоўную забарону і прыходзіць зноў не як госць, а як гаспадар; пасля прыходу незнаёмых паліцаяў Пятрок са Сцепанідай разумеюць, што яны вернуцца; забойства Янкі паказвае, што бяспекі ў межах дому болей няма.

Асабістая трагедыя адбываецца на фоне разбуральных гістарычных падзей. Знішчэнне дому суадносіцца з усеагульнай трагедыяй, што дазваляе выявіць характэрны досвед пэўнай эпохі. Так, у «Раскіданым гняздзе» Я. Купалы кантэкстам выступае поўная ўлада пана над сялянамі і няўвага да іх лёсу; у «Пошуках будучыні» К. Чорнага войны вырываюць герояў са звыклага жыцця; у «Людзях на балоце» І. Мележа калектывізацыя пазбаўляе сялян улады над зямлёй. У «Знаку бяды» фонам для гісторыі Сцепаніды і Петрака выступае вайна і даваенныя падзеі ў вёсцы – рэформы і перадзел зямлі ў 1920-я і калектывізацыя ў 1930-я гады. Ува ўсіх згаданых творах гістарычныя абставіны адыгрываюць значную ролю ў разбурэнні дому, што выводзіць дадзеную праблему на ўзровень нацыянальнага і, адпаведна, пашырае разуменне дому да больш шырокай агульнай прасторы (краіны, хоць часта пра гэта не гаворыцца наўпрост).

Пры гэтым да тыпізаванага досведу дадаецца індывідуальная катастрофа, якая змяшчае акцэнт з чалавека як ахвяры абставін на яго адказнасць за ўласны лёс. Героі В. Быкава рэагуюць на вайну як на непадуладную катастрофу [1, с. 17, 281], тады як паводзіны паліцаяў выклікаюць у іх абурэнне і пратэст [1, с. 41]. Напад ворага ўспрымаецца як навала, тады як жорсткасць аднавяскоўцаў правакуе шукаць прычын у мінулым. Поруч са знешняй сілай існуе ўнутраная логіка мікрасвету, што ператварае вайну ў каталізатар, а не першапрычыну катастрофы.

Акрамя таго, у аповесці «Знак бяды» гістарычныя падзеі не заўсёды выступаюць негатыўнымі: у 1921-м годзе Сцепаніда і Пятрок атрымліваюць зямлю ў выніку перадзелу, які быў часткай тагачаснай палітыкі. Знешняя сіла апынаецца спрыяльнай для герояў, чаму яны радуюцца: «Праўда, пасля рэвалюцыі ўсё тут крута змянілася, павярнулася да такіх, як яна, другім, лепшым, бокам: пан Жулега ўцёк у Варшаву, скончыў свой шлях на зямлі стары Яхімоўскі, і яны з Петраком перабраліся з істопкі ў хату і атрымалі ад новай улады дзве дзесяціны хутарской зямлі» [1, с. 141]. Вайна прыносіць пакуты і гібель, аднак напачатку ратуе сядзібу ад пераносу ў вёску і адмяжоўвае герояў ад свету праз узарваны мост. В. Быкаў паглыбляе разуменне гістарычнага кантэксту і, зноў жа, пераносіць акцэнт на чалавечы досвед, які змяняецца з часам: глабальныя падзеі могуць як даць героям дом, так і разбурыць яго. Гэта суадносіцца з развагамі пра час: «Каб гэта было дадзена чалавеку – хоць трошачкі зазірнуць наперад, угледзець наканаванае яму, але схаванае за пластамі часу, тое, што з усёй відавочнасцю адкрыецца ў наплыве наступных дзён. Дык дзе там! Нічога не можа чалавек уведаць з свайго будучага і, бывае, радуецца з таго, што неўзабаве зробіцца прычынай

гора, а то плача над тым, што пасля выклікае хіба што ўсмешку» [1, с. 138]. Абмежаванасць чалавечага досведу ў спалучэнні з выпадковасцю ўплыву агульных падзей на лёс асобнага чалавека гавораць пра іншую прыроду асабістай трагедыі, наяўнасць унутраных прычын для яе разгортвання.

У Петрака і Сцепаніды ніколі не было па-сапраўднаму свайго дому, што адрознівае іх ад герояў іншых згаданых твораў беларускай літаратуры, дзе раскрываецца тэма «раскіданага гнязда». Зяблікаў зганяюць з зямлі, дзе жылі іх продкі: «Бацькі і дзяды жылі на гэтым куску зямелькі. Вечна думалі жыць <...> Вечна думалі жыць, а цяпер! Цяпер сын і ўнукі служыць і жабраваць... гаспадарскія сын і ўнукі» [2, с. 14]. Значэнне мае не столькі тое, хто валодае зямлёй па праве (пан), колькі прывязанасць уласнага роду да пэўнага месца, што для герояў В. Быкава пры адсутнасці сям'і немагчыма. Хутар належыць роду Яхімоўскіх і пераходзіць да Петрака і Сцепаніды па праве экспрапрыяцыі, яны застаюцца на той самай зямлі і ў той самай хаце. Героі апынаюцца з адваротнага боку канфлікту, раскрытага ў «Раскіданым гняздзе»: яны забіраюць сабе чужое, і хаця робяць гэта не па сваёй волі, але ўсё ж згаджаюцца на перадзел: «Хай сабе ў думках і спадзяваннях, усё ж яна паквапілася на чужое» [1, с. 152]. На баку герояў знаходзіцца сацыяльная справядлівасць, бо беззямельныя сяляне атрымліваюць ва ўласнасць зямлю, на якой працуюць, што ўспрымаецца як пазітыўная змена. Тым не менш, у аповесці «Знак бяды» падзеі 1921-га года падаюцца як зыходны пункт катастрофы, якая адбываецца з персанажамі. Сцепаніда робіць выбар і карыстаецца сітуацыяй: «…ранкам яна адчула сябе больш пэўна, выразна зразумела, што іх ужо не двое ў сям'і, а бадай што трое, у яе два галасы – яе і дзіцяці – супраць аднаго нерашучага голасу Пётры» [1, с. 152]. Яхімоўскі не ў стане перажыць страту маёмасці – яго лёс такі самы, як лёс Лявона ў п’есе Я. Купалы. Сацыяльная справядлівасць, такім чынам, уступае ў канфлікт са справядлівасцю чалавечай: «На чужым і дармовым шчэнсця не бэндзе» [1, с. 155].

Праблема пераходу чужога ў сваё прачытваецца як адзін з узроўняў праблемы памежнага стану. Імя Яхімоўскага застаецца назвай хутара нават пасля змены гаспадароў і распаду маёнтка – дом герояў захоўвае маркер чужасці і напамін пра мінулае. Той факт, што пан гіне (а не, напрыклад, уцякае, як пан Жулега [1, с. 141]), стварае сітуацыю, калі ранейшага гаспадара болей не існуе, аднак «чужасць» хутара па-ранейшаму прысутнічае, што пераносіць праблему падзелу свайго і чужога ў плоскасць унутранага. Пятрок бачыць ва ўласнай сядзібе азнакі чужога: «Шмат год ён тут быў гаспадар, а цяпер глядзеў на ўсё быццам чужымі вачыма, быццам ён куды ад'язджаў, развітваўся, і яму было шкада ўсяго» [1, с. 18]; «Не ён іх [ліпы] саджаў, саджалі людзі, ліпы раслі тут пры ўсім ягоным жыцці – ці гожа гэта скараняць людское?» [1, с. 20]. У герояў ніхто не можа забраць дом назад, але гэтаксама ніхто не можа зрабіць яго цалкам сваім – гвалтоўнае прысвойванне чужога зрабіла яго назаўжды чужым. Перашкодай для таго, каб займець напраўду сваё месца, з’яўляецца ўласнае мінулае і ўласны выбар, якія пакідаюць герояў у памежным стане з адчуваннем віны.

Лакалізаванасць дзеяння аповесці на сядзібе, ізаляванасць мікрасвету спалучаюцца з унутранай супярэчлівасцю гэтага месца для персанажаў. З аднаго боку, вакол гэтага месца сканцэнтраванае ўсё іх жыццё, з іншага – гэта не іх месца. Дынаміка твора задаецца мінімізацыяй прасторы (імкненне адасобіцца, сварыць свой прадказальны свет) і ўнутранай складанасцю мікрасвету, што выяўляецца праз згаданую вышэй змену значэння месца ў рамках шматузроўневай часавай структуры. Памяць, мінулае захоўваюць у адасобленай прасторы тую складанасць, памежнасць, якія пазбаўляюць герояў дому, а значыць, і месца ў свеце.

Такім чынам, тэма «раскіданага гнязда» раскрытая ў шэрагу этапных твораў беларускай літаратуры, у тым ліку ў аповесці В. Быкава «Знак бяды». Аповесць паказвае адасобленых адно ад аднаго людзей, у якіх ніколі не было ні сям'і, ні па-сапраўднаму свайго месца. Прасторавая структура суадносіцца з узроўнямі апазіцыі «свой – чужы» і ў рамках складанай часавай структуры выяўляе разбурэнне дому ў дынаміцы. Шукаючы прычыны катастрофы праз рэтраспектыўнае асэнсаванне досведу, В. Быкаў робіць акцэнт на вытоках разбурэння, яго невідавочных азнаках, ставіць пад пытанне саму магчымасць існавання свайго на месцы чужога. «Раскіданае гняздо» – не толькі катастрофа, прывязаная да канкрэтных абставін, але і спосаб быцця наогул, калі чалавек намагаецца стварыць уласны свет, аднак яго выбар непазбежна прыводзіць да разбурэння – знешняга і ўнутранага.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Быкаў, В. Знак бяды / В. Быкаў. – Мінск : Папуры, 2022. – 320 с.

2. Купала, Я. Раскіданае гняздо / Я. Купала. – Вільня : Выдавецтва Менскага Камісарыяту Асьветы, 1919. – 82 с.